Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 9 ЧЭРВЕНЯ 1977 г.

№ 21 (1171)

Цана 2 кап.

Наш кандыдат

## ЯЕ ПАЗІЦЫЯ— АКТЫЎНАЯ

Два гады назад пераступіла парог нашага універсітэта Зінаіда Мельнік. У заяве, якую яна падала ў прыёмную камісію, у графе «спецыяльнасць» было напісана: гісторыя. Першы экзамен —гісторыю СССР здала на «выдатна». Ад далейшай здачы уступных экзаменаў была вызвалена: мела залаты медаль пасля заканчэння сярэдняй школы.

Увесь жыццёвы вопыт Зіны вылічваецца школьнымі гадамі. Але да паступлення ва універсітэт яна паспела зрабіць шмат: як дэлегат прымала ўдзел у рабоце XVII з'езда ВЛКСМ, у Старадарожскай сярэдняй школе № 2 выступіла з цікавымі ініцыятывамі — стварыць у школе камсамольскі атрад піянерважатых, які б меў свой дэвіз, сваю песню, і арганізаваць працоўны атрад старшакласнікаў «Вікторыя», які цяпер фарміруецца ў школе штогод. Камсамольцы школы выбралі Зіну сваім важаком. У выбары яны не памыліліся: строгі, прынцыповы сакратар камітэта камсамола школы, Зіна Мельнік змагла надаць камсамольскай рабоце творчы, дзелавы характар. Патрабуючы ад іншых,. яна з усёй патрабавальнасцю адносілася і да сябе.

Паступіўшы ва універсітэт, паставіла перад сабой задачу: за гады вучобы зрабіць як мага больш, атрымаць неабходныя прафесійныя веды, з'ездзіць у студэнцкі будаўнічы атрад, на высокім узроўні весці даручаны ёй участак грамадскай работы.

У камітэце камсамола універсітэта Зіна ўзначаліла групу «Доўг». Да даручэння аднеслася з усёй адказнасцю. Перш за ўсё падабрала актыў груп, упарадкавала вядзенне дакументацыі, захоўванне матэрыялаў. Работа адбірае амаль увесь вольны час. Акрамя таго, трэба паспець паглядзець новы фільм, тэатральную пастаноўку, пачытаць мастацкую кнігу. Сяброўкі па пакою часам наракаюць: Зіна зусім пазбавіла сябе адпачынку. А яна не скардзіцца— прывыкла да такога рытму жыцця, да штодзённага клопату.

У сваёй групе Мельнік вызначаецца рэдкай прынцыповасцю. Зіна ніколі не баіцца ўваходзіць у канфлікт, калі чыйсьці пункт гледжання супярэчыць яе думцы. Магчыма таму ў яе ёсць і свае «незычліўцы». Але нават гэта гаворыць аб тым, што ў кожным пытанні, у кожнай справе сваёй групы яе штосьці хвалюе, яе пазіцыя заўсёды актыўная. Так было яшчэ ў школе, калі Зіна на камсамольскім сходзе выступіла супраць думкі выкладчыка, якая была памылковай. Так бывае і цяпер, калі яна выступае на сходах групы або курса.

Цяпер клопатаў у Зіны прыбавілася: камсамольцы універсітэта вылучылі яе кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных. На днях адбылася першая сустрэча з выбаршчыкамі. Таварышы па вучобе і грамадскай рабоце аказалі ёй вялікі давер, права прадстаўляць наша студэнцтва ў органах дзяржаўнай улады. Ёсць усе падставы меркаваць, што гэты давер Зінаіда Мельнік апраўдае з гонарам.

В. РОШЧЫН.

# ЦЕСНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Супрацоўніцтва БДУ імя У. І. Леніна і Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта імя В. Капсукаса мае даўнія і трывалыя сувязі. Сюды ўваходзяць абмен вучонымі для чытання лекцый, сумесная навуковая работа, правядзенне навуковых канферэнцый і іншыя формы супрацоўніцтва.

Так, прафесар БДУ М. А. Жыдовіч пастаянна кансультуе русістаў ВДУ, працуючых над вывучэннем старажытных помнікаў беларускай мовы. Прафесар В. В. Анічэнка зрабіў даклад аб беларусістыцы для філолагаў ВДУ. У БДУ ст. выкладчык Вільнюскага універсітэта В. Піpановіч прачытаў курс лекцый па матэматычнаму забеспячэнню вылічальных комплексаў і АСК і г. д.

Прафесар БДУ А. Я. Супрун з'яўляецца кіраўніком дысертацыйнай работы выкладчыка ВДУ Э. Р. Ласан; факультэты матэматыкі абменьваюцца аспірантамі, шэраг выкладчыкаў Вільнюскага універсітэта абаранялі кандыдацкія дысертацыі ў БДУ, а выкладчык нашага універсітэта І. М. Зуеў — у ВДУ. Юрыдычныя факультэты працягваюць распрацоўку тэмы «Дзяржаўныя прававыя інстытуты па Літоўскіх статутах». Гэта прыклады сумеснай навуковай работы двух універсітэтаў.

У мінулым годзе на юрыдычным факультэце ВДУ была праведзена рэспубліканская канферэнцыя «Роля дзяржаўна-прававых навук у развітым сацыялістычным грамадстве», у рабоце якой актыўны ўдзел прынялі выкладчыкі БДУ.

Цесныя сувязі падтрымліваюць і студэнцкія грамадскія арганізацыі гістарычных факультэтаў — абмен дэлегацыямі, абмен вопытам работы.

Рознабаковыя сувязі дзвюх ВНУ шырацца і мацнеюць. На 1977 год паміж БДУ імя У. І. Леніна і Вільнюскім дзяржаўным універсітэтам імя В. Капсукаса заключан дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве. Для падпісання дагавору ў Вільнюс выязджалі прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце А. Я. Малышаў, начальнік вучэбнага аддзела В. С. Далгарукаў і старшыня мясцкома П. А. Дубавец.

«У алказ на рашэнні XXV з'езда КПСС, пастанову ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ аб разгортванні Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва за паспяховае і якаснае выкананне народнагаспадарчага плана на 1977 год, — гаворыцца ў дагаворы, — работнікі Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна і Вільнюскага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя В. Капсукаса заключаюць дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве на 1977 год і прымаюць наступныя абавязацельствы:

1. Падрыхтаваць да абароны супрацоўнікамі і аспірантамі універсітэта доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый (ВДУ — 51, БДУ — 107).

2. Ахапіць формамі павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў універсітэта (ВДУ — 145, БДУ — 260).

3. Падрыхтаваць да выдання манаграфій, зборнікаў навуковых работ і даведнікаў (ВДУ — 20, БДУ — 42).

4. Падрыхтаваць да друку або апублікаваць навуковых або навукова-папулярных артыкулаў і дакладаў (ВДУ — 2050, БДУ — 2240).

5. Прадставіць на афармленне вынаходніцтвы і рацыяналізатарскія прапановы (ВДУ — 25, БДУ — 200).

6. Правесці ўсесаюзныя і рэспубліканскія канферэнцыі, прысвечаныя актуальным пытанням навукі і практыкі (ВДУ — 16, БДУ—4).

7. Выканаць план гасдагаворных навукова- даследчых работ на суму млн. руб. (ВДУ — 2,6, БДУ — 5,2).

8. Атрымаць эканамічны эфект ад укаранёных навукова-даследчых работ у народнай гаспадарцы на суму млн. руб. (ВДУ — 2,9, БДУ — 4,5).

9. Укараніць у народную гаспадарку навукова-даследчых работ (ВДУ — 50, БДУ — 42).

10. Падрыхтаваць да выдання падручнікі, дапаможнікі і метадычныя ўказанні, цыклы лекцый (ВДУ — 120. БДУ — 258).

11. Прачытаць лекцыі для насельніцтва па актуальных пытаннях тэорыі і практыкі камуністычнага будаўніцтва, дасягненнях сучаснай навукі (ВДУ — 4250, БДУ — 6500).

12. Падрыхтаваць і прачытаць на навуковых студэнцкіх канферэнцыях дакладаў (ВДУ — 1100, БДУ — 1500).

13. Падрыхтаваць да друку або апублікаваць студэнцкіх навуковых работ (ВДУ — 55. БДУ — 100).

14. Падрыхтаваць для прадстаўлення на рэспубліканскія і ўсесаюзныя агляды-конкурсы студэнцкіх навукоковых работ (ВДУ — 180, БДУ — 670).

15. Сфарміраваць аб'яднаны студэнцкі будаўнічы атрад агульнай колькасцю. чалавек (ВДУ — 1300, БДУ — 1550).

16. Падрыхтаваць майстроў спорту, кандыдатаў у майстры і спартсменаў першага разраду, чалавек (ВДУ — 105, БДУ — 86)».

Для рашэння ўсіх пытанняў, звязаных з правядзеннем спаборніцтва, створана камісія з прадстаўнікоў БДУ і ВДУ. Вынікі спаборніцтва будуць падводзіцца асобна па кожнай ВНУ, і дасягнутыя паказчыкі будуць разглядацца на пасяджэнні камісіі.

Камісія правядзе свае пасяджэнні ў верасні 1977 і ў студзені 1978 года. Канчатковыя вынікі спаборніцтва вызначаюцца на 1 студзеня 1978 года.

Асноўнымі прынцыпамі арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва з'яўляюцца: канкрэтнасць, параўнальнасць вынікаў і галоснасць. Гэтымі ленінскімі прынцыпамі і кіруюцца калектывы БДУ і ВДУ пры арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва і падвядзенні яго вынікаў.

Дагавор з'яўляецца практычным крокам для мабілізацыі намаганняў калектываў дзвюх ВНУ краіны па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі, выкананню ўказанняў XXV з'езда КПСС па рашэнню галоўнай задачы, пастаўленай перад вышэйшай школай — задачы павышэння якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў.



Студэнтка першага курса хімічнага факультэта Л. Фянько на занятках у лабараторыі.

## Пад знакам моцнай дружбы

Закончыла работу IV савецка-балгарская студэнцкая навуковая канферэнцыя. Яна праходзіла па ініцыятыве рэктарата нашага універсітэта і Беларускага аддзялення таварыства савецка-балгарскай дружбы.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуўся дацэнт Сафійскага універсітэта імя Клімента Ахрыдскага Йордан Тончаў.

У рабоце навуковай канферэнцыі прынялі ўдзел савецкія і балгарскія студэнты, якія вучацца ў ВНУ Мінска. Выступаючыя абмеркавалі пытанні інтэрнацыянальнай дружбы беларускай і балгарскай моладзі.

Балгарскія студэнты Уладлен Петкаў і Пётр Тонеў зрабілі даклады аб сацыялістычным будаўніцтве ў НРБ. На канферэнцыі прысутнічалі адказны сакратар Беларускага аддзялення таварыства савецка-балгарскай дружбы С. І. Сідаш і госці з Сафійскага універсітэта Марыян Андрэеў і Павел Аляксандраў.

Канферэнцыя прайшла ў дзелавой, брацкай абстаноўцы.

## Выбаршчыкі абмяркоўваюць праект

Яшчэ ў красавіку пачаў работу агітпункт выбарчага ўчастка № 32, які размясціўся ў памяшканні НДІ ПФП. За прайшоўшы час агіткалектыў участка арганізаваў шэраг разнастайных мерапрыемстваў. Выбаршчыкаў рэгулярна запрашаюць на лекцыі аб міжнародным становішчы. Прайшла справаздача дэпутатаў раённага і гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных. Былі арганізаваны сустрэчы з кандыдатамі ў дэпутаты, з ветэранамі вайны і працы. Праведзены вечар маладога выбаршчыка, некалькі юрыдычных кансультацый і нават бліц-турнір па шашках сярод выбаршчыкаў.

У мінулую нядзелю агіткалектыў гэтага выбарчага ўчастка арганізаваў сярод студэнтаў БДУ і супрацоўнікаў НДІ ПФП абмеркаванне праекта новай Канстытуцыі СССР. Лекцыю аб праекце Канстытуцыі прачытаў дацэнт юрыдычнага факультэта Я. М. Тагуноў. Выбаршчыкі горача падтрымалі і адобрылі праект.

## Камсамольскае жыццё

# СТУДЭНЦКІ КАНТРОЛЬ

У нашым універсітэце ў пачатку гэтага навучальнага года быў створан студэнцкі сектар быту, адпачынку і аховы сацыялістычнай маёмасці пры камітэце камсамола БДУ.

Па сваёй структуры гэта вельмі сур'ёзная арганізацыя, своеасаблівы «аддзел студэнцкага кантролю» ў рамках БДУ. Сектар правярае вучобу актыву па арганізацыі рэйдаў, рыхтуе матэрыялы для пасяджэнняў штаба «КП», здзяйсняе сувязь з сектарамі камітэта камсамола БДУ, органамі народнага кантролю, дырэкцыяй студгарадка.

«Аддзел студэнцкага кантролю» праводзіць рэйды-праверкі жылля студэнтаў, ленінскіх пакояў, чытальных залаў, бібліятэк, правярае арганізацыю вечароў адпачынку.

Сектар адказвае за арганізацыю харчавання і культурнага абслугоўвання ў студэнцкіх сталовых і буфетах, кантралюе работу студсаветаў, камендантаў, стараст паверхаў, культурна-масавых сектараў і жыллёва-бытавых сектараў інтэрната. Што ж зроблена новым сектарам?

«...Сектарам сумесна з камісіяй народнага кантролю, камітэтам камсамола, мясцкомам БДУ былі праведзены рэйды-агляды прадпрыемстваў грамадскага харчавання універсітэта. У выніку праведзеных аглядаў было ўстаноўлена наступнае:

«— не ўсюды санітарны стан адпавядае патрабаванням нормы. Так, у буфеце інтэрната № 2 дрэнна мыецца посуд, нерэгулярна ўбіраюцца сталы, на сталах няма салфетак, асартымент страў не адпавядае асартыменту-мінімуму;

— у буфеце інтэрнатаў № 4 і № 2 адсутнічае мясная гастранамія, няма чаю, малака, кампоту (вось цяпер і кажы, што студэнты чаем сыты);

— у буфеты прадукты паступаюць не заўсёды свежымі, сустракаецца недавага страў, не заўсёды папраўлены прылады ўзважвання...» — вось толькі адна выпіска са справаздачы сектара аб праробленым.

Рэйдавымі камісіямі быў устаноўлен тэрмін, за які неабходна ліквідаваць адзначаныя недахопы. Пасля правядзення рэйдаў-праверак абслугоўванне студэнтаў значна палепшылася.

Сектар вядзе кантроль за правядзеннем рэйдаў-праверак «КП» факультэтаў. Так, рэйдавая брыгада «КП» філалагічнага факультэта ў саставе старшыні Аляксандра Радзюка, старшыні жыллёва-бытавой камісіі Ірыны Карнейчык, члена «КП» Пятра Кузьмічова адзначала рэзультаты праверкі ў красавіку стану пакояў у інтэрнаце № 4. Было выяўлена і ўказана адміністрацыі інтэрната, што ў многіх пакоях, такіх, як 405, 420, 431, 434 і інш., электрычнае асвятленне няспраўнае, у дрэнным стане знаходзіліся нішы для чытання.

Прыведзены толькі некаторыя штрыхі работы новага сектара камітэта камсамола БДУ.

**А. БАРЭЦКІ,**
**адказны за сектар быту, адпачынку і аховы сацыялістычнай маёмасці пры камітэце камсамола БДУ.**

**А. СЕРАБРАКОЎ,**
**студэнт I курса журфака.**

# НІВОДНАГА АДСТАЮЧАГА ПОБАЧ!

У верасні мінулага года былі падведзены вынікі агляду-конкурсу на лепшую акадэмічную групу пад дэвізам: «Ніводнага адстаючага побач!» Конкурс прайшоў пад знакам падрыхтоўкі да 60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Вынікі паказалі, што вучэбныя групы якасна і своечасова выконваюць вучэбны план, студэнты актыўна ўдзельнічаюць у навукова-даследчай і грамадскай рабоце.

Адной з лепшых акадэмічных груп універсітэта стала група IV курса гістарычнага факультэта аддзялення палітэканоміі (праформорг групы — Уладзімір Гуз, сакратар камсамольскай арганізацыі — Раіса Грамыка, староста групы — Уладзімір Мядзелец).

Тут сістэматычна праводзяцца сходы, на якіх абмяркоўваецца ход сацыялістычнага спаборніцтва. Студэнты ўносяць свае прапановы па павышэнню паспяховасці, вызначаюць новыя задачы.

Кожны студэнт прыняў асабісты комплексны план, абавязаўся павышаць сваю паспяховасць, актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці, у навукова-даследчай рабоце.

У групе — 5 членаў партыі. Экзаменацыйную сесію ў групе на «выдатна» здалі 5 чалавек, на «добра» і «выдатна» — 15 чалавек. Сярэдні бал паспяховасці склаў 4,46. Адзін са студэнтаў групы — В. Вараб'ёў з'яўляецца імянным стыпендыятам.

За выдатную вучобу 4 студэнты ўзнагароджаны ганаровым знакам ЦК ВЛКСМ «Выдатнік вучобы», 8 — граматамі, 2 — ганаровым знакам «Малады гвардзеец пяцігодкі».

У групе былі праведзены палітінфармацыі па матэрыялах XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ, многія пытанні абмяркоўваліся на семінарах. У час сельгасработ студэнты выступілі з дакладамі на тэмы: «Развіццё сельскай гаспадаркі СССР у дзесятай пяцігодцы», «Праграма міру КПСС — аснова міжнароднай палітыкі Савецкай дзяржавы», «Імперыялістычны мілітарызм — вораг народаў» і інш.

У грамадскім жыцці аддзялення і універсітэта ўдзельнічаюць М. Кобрык — член камітэта камсамола факультэта, М. Галаўко — кіраўнік групы гідаў пры камітэце камсамола універсітэта, В. Вараб'ёў — сакратар камсамольскага бюро аддзялення. На навуковай студэнцкай канферэнцыі 7 работ студэнтаў групы былі прадстаўлены на рэспубліканскі конкурс. Шэсць з іх атрымалі дыпломы I і II катэгорыі. 2 работы на ўсесаюзным конкурсе атрымалі выдатныя адзнакі.

Два чалавекі працавалі ў зімовым будатрадзе. У час праходжання вучэбнай практыкі ў калгасах было прачытана 80 лекцый па актуальных праблемах сучаснасці.

Кожны трэці студэнт групы ўдзельнічае ў мастацкай самадзейнасці факультэта.

У групе — 4 залатыя значкісты ГПА, амаль палова студэнтаў займаецца ў спартыўных секцыях.

Вялікая ўвага ўдзяляецца эстэтычнаму выхаванню. Наведваюцца музеі, тэатры, праводзяцца гутаркі аб мастацтве.

Аглядавая камісія універсітэта адобрыла работу актыву і ўсіх студэнтаў групы, адзначыла іх добрасумленныя адносіны да вучобы, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і навукова-даследчай рабоце і арганізавала ў час зімовых канікулаў паездку па маршруту Мінск — Уладзімір — Суздаль — Багалюбава — Мінск.

**В. КАМАРОЎСКІ,**
**старшыня вучэбна-вытворчай камісіі БДУ.**

# СКАНЦЭНТРАВАЦЬ УВАГУ

*(Вынікі агляду сродкаў галоснасці ў рабоце груп народнага кантролю).*

Адным з найважнейшых прынцыпаў, сфармуляваных У. І. Леніным і пакладзеных у аснову штодзённай дзейнасці органаў народнага кантролю, з'яўляецца прынцып галоснасці. Выкарыстанне шырокай галоснасці ў рабоце кожнай групы народнага кантролю — важная задача, ад вырашэння якой у значнай меры залежаць нашы поспехі ў здзяйсненні народнага кантролю.

З мэтай абмену вопытам і актывізацыі работы груп народнага кантролю з 10 па 15 мая гэтага года быў праведзен агляд сродкаў галоснасці. У аглядзе прынялі ўдзел факультэцкія групы народнага кантролю іншых структурных падраздзяленняў універсітэта. Агульнае кіраўніцтва аглядам здзяйсняла камісія, зацверджаная на пасяджэнні універсітэцкай групы народнага кантролю, у саставе: А. Акінчыц (старшыня), Е. Тарасевіч, І. Літвіноўскі, В. Яноўскі, Г. Васільева, Л. Пясткоўская.

Правільна разумеюць і пастаянна падтрымліваюць прынцып галоснасці групы народнага кантролю хімічнага, біялагічнага, геаграфічнага факультэтаў, інстытута павышэння кваліфікацыі. На гэтых факультэтах абсталяваны стэнды, на якіх рэгулярна змяшчаецца інфармацыя аб усіх мерапрыемствах, якія праводзяцца народнымі кантралёрамі. ГНК біяфака працуюць у цеснай сувязі з «Камсамольскім пражэктарам».

Але ў асобных групах народнага кантролю пытанням галоснасці не ўдзяляецца патрэбнай увагі. Да гэтага часу не маюць асобных стэндаў і не інфармуюць грамадскасць аб сваёй рабоце групы народнага кантролю гаспадарчай часткі, друкарні, ваеннай кафедры. На многіх стэндах вывешваюцца толькі састаў групы і план работы і адсутнічаюць акты праверак, якія праводзяцца народнымі кантралёрамі.

Нельга не сказаць аб тым, што факультэцкія групы народнага кантролю не выкарыстоўваюць такую магчымасць для развіцця галоснасці, як публікацыя сваіх матэрыялаў ва універсітэцкай шматтыражнай газеце. Рэдка яшчэ выступаюць народныя кантралёры з матэрыяламі праверак на прафсаюзных і камсамольскіх сходах.

Падводзячы вынікі агляду, камісія пастанавіла размеркаваць месцы наступным чынам:

I месца — хімфак (старшыня ГНК Г. Васільева)

II месца — ІПК (старшыня ГНК Н. Альхоўка)

III месца — біяфак (старшыня ГНК Л. Лук'яновіч).

**А. АКІНЧЫЦ,**
**намеснік старшыні ГНК БДУ імя У. І. Леніна.**

# НА СТАРЦЕ «МАРА»

Калі б вы ні зайшлі ў камітэт камсамола філалагічнага факультэта, вы заўсёды ўбачыце дзяўчат, якія нешта горача абмяркоўваюць. І напэўна пачуеце назву, якая знаёма, мабыць, кожнаму на філфаку — «Мара». Так называецца адзін з СБА факультэта.

Не першы год існуе гэты атрад, і кожны год байцоў яго чакаюць па аднаму і таму ж адрасу — у Слабадзейскім раёне Малдаўскай ССР. Гэтым летам «Мара» ў саставе 50 чалавек (з іх усяго 10 рабят, астатнія — дзяўчаты) зноў паедзе на сельгасработы.

«Вось дзе добра! — скажаце вы. — Сонца, цяпло... збірай сабе памідоры, загарай на здароўе. Гэта табе не цагліны цягаць». Але не спяшайцеся з вывадамі. Спытайце дзяўчат, і яны раскажуць, як ад спякоты цямнее ў вачах, як зацякаюць і становяцца, нібы чужыя, рукі, што стаміліся ад аднастайнай работы. І тым не менш, як расказала камісар атрада Жана Рымкевіч, папасці ў атрад вельмі цяжка: шмат жадаючых. З усіх СБА факультэта (а іх чатыры) у «Мару» самы вялікі конкурс.

Байцы «Мары» перакананы: будатрад — не толькі работа, гэта — школа дружбы, брацтва, узаемавыручкі, школа грамадзянства. І да гэтага адказнага перыяду неабходна рыхтавацца раней, загадзя, каб потым не было ў атрадзе ганебнай штурмаўшчыны.

Як рыхтуецца да свайго трэцяга працоўнага семестра «Мара» ў гэтым годзе, расказвае Наташа Мастыкава, адказная за ваенна-патрыятычнае выхаванне ў атрадзе:

— Наперадзе складаная і цяжкая работа. Таму з асаблівай увагай засвойваем правілы тэхнікі бяспекі. Да пачатку работ мы правядзем чатыры працоўныя дэсанты. Бачылі б вы, як цудоўна працавалі нашы дзяўчаты ў час першага працоўнага дэсанта на будаўніцтве інстытута павышэння кваліфікацыі! 18 дакладаў па самай разнастайнай тэматыцы павязе наша лектарская група. Мы аформілі 4 стэнды, якія разам з бібліятэкай вязем у падарунак падшэфнай школе. Два з іх прысвечаны дзейнасці Веры Харужай, за прысваенне імя якой змагаецца наш атрад. Працягваюцца рэпетыцыі нашай агітбрыгады, і рэдкалегія рыхтуецца вытрымаць суровае выпрабаванне будатрадаўскіх «Маланак». Такім чынам, чакаем трэці працоўны!

У мінулым годзе «Мара» заняла першае месца сярод будатрадаў па сваёй зоне і атрымала ва ўзнагароду тэлевізар. Поспехаў вам, дзяўчаты і хлопцы, і ў гэтым годзе!

**Н. КОСАРАВА.**

# ПРАВЕРКА ПЕРАД СТАРТАМ

**Флаг першага злёту студэнцкіх будаўнічых атрадаў быў падняты на маляўнічым беразе Нёмана ў Стаўбцоўскім раёне. Каля 250 юнакоў і дзяўчат — байцоў лепшых будаўнічых атрадаў БДУ сабраліся, каб яшчэ раз праверыць сваю гатоўнасць да ўдзелу ў трэцім працоўным семестры.**

**За час падрыхтоўчага перыяду байцамі 66 лінейных СБА, сфарміраваных ва універсітэце, было дадзена каля 200 канцэртаў, прачытана 392 лекцыі, праведзена 207 суботнікаў і працоўных дэсантаў. Многія атрады выступілі з цікавымі ініцыятывамі. СБА «Універсітэцкі», напрыклад, звярнуўся да студэнтаў з заклікам: «Кожнаму байцу СБА адпрацаваць адзін дзень на будаўніцтве Мінскага Палаца піянераў». Пачын быў падхоплен усімі лінейнымі атрадамі універсітэта.**

**Зараз у БДУ шырыцца рух пад дэвізам: «На студэнцкую будоўлю — без адзінай тройкі!», ініцыятарамі якога выступілі студэнты-матэматыкі. Думаецца, што гэта стане яшчэ адным стымулам павышэння паспяховасці.**

**У ходзе падрыхтоўчага перыяду універсітэцкія атрады ўстанавілі шэфскія сувязі з сямю школамі Мінска. Цікава, на высокім мастацкім узроўні прайшоў агляд-конкурс агітбрыгад. Шырокае распаўсюджанне атрымаў вопыт работы зімовых студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Сёння СБА імя І. В. Курчатава, які прайшоў працоўную загартоўку ў час зімовых канікулаў, — лепшы ва універсітэце.**

**На адкрыцці злёту ля мемарыяльнага Знака студэнтам, выкладчыкам і супрацоўнікам універсітэта, загінуўшым у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, са словамі наказу звярнуліся да студэнтаў прарэктар БДУ А. Я. Малышаў, намеснік камандзіра рэспубліканскага СБА В. Сілін, камісар Мінскага абласнога студэнцкага будаўнічага атрада М. Ціцянкоў.**

**Гэты працоўны семестр — дзесяты па ліку ў камісара зводнага атрада універсітэта Веры Прокашавай. Фізік Лёня Сімяненка за актыўны ўдзел у студэнцкім будаўнічым руху ўзнагароджан ордэнам «Знак Пашаны». А вось камандзір атрада «Радзімічы» А. Чыкілёў упершыню павядзе сваіх байцоў на будаўнічыя пляцоўкі. Падрыхтоўчы перыяд яго атрад заканчвае паспяхова: дабіўся права ўдзельнічаць у злёце.**

**Праграма злёту вельмі шырокая. Ідзе агляд-конкурс агітбрыгад. А каля палаткі аргкамітэта сабралася журы: рашае, якая з насценгазет лепшая на злёце. У разгары спаборніцтвы па мініфутболу. Па лясных сцежках праходзіць маршрут спартыўнай эстафеты. Байцы арганізавалі працоўны дэсант на Стаўбцоўскі лесазавод. Прыбіралі тэрыторыю, працавалі на будаўніцтве новага корпуса. З заданнем справіліся паспяхова.**

**Прадэманстравалі сваё майстэрства і павары атрадаў: гарачы абед удаўся на славу.**

**Абстаноўка палатачнага гарадка, будатрадаўская форма, касцёр, песні... Адчуваецца блізкі подых працоўнага лета.**

**На агульнай лінейцы падвялі вынікі. Лепшым СБА стаў атрад «Кастрычнік» гістарычнага факультэта.**

**...Злёт закончан. Да сустрэчы, працоўны семестр!**

**В. ГАЙ-ДЗЯЛЯНКА.**
Фота аўтара.



# ЛЮБІМАЯ РАБОТА

Работа, ад якой не толькі сам атрымліваеш задавальненне, але святло якой нясеш людзям, — што можа быць цудоўней?

28 гадоў жыцця прысвяціла Валянціна Паўлаўна Ананька вялікаму свету кніг. У 1949 годзе прыйшла яна ў бібліятэку нашага універсітэта і з тае пары свае веды і вопыт шчодра аддае маладому пакаленню.

Зараз бібліятэка юрфака, якую яна ўзначальвае, налічвае каля 3000 чытачоў і звыш 100 000 экземпляраў літаратуры (гэта больш, чым у бібліятэцы імя Я. Купалы). Не дзіўна, што іменна Валянціна Паўлаўна кіруе работай бібліятэкі. Гэта чалавек з вялікім практычным вопытам, чалавек шчодрай душы. Павага і прызнанне ўсяго калектыву — як гэта важна ў любой рабоце.

Ірына Уладзіміраўна Арэхоўская, дырэктар бібліятэкі універсітэта, вось што расказала аб В. П. Ананька:

— Ёсць у Валянціны Паўлаўны вельмі каштоўная якасць — не скардзіцца на цяжкасці, заўсёды спраўляцца з імі і іншым дапамагаць. У Валянціны Паўлаўны няма слоў «не хачу» ці «не магу». «Цяжка, але спраўлюся», — яе пазіцыя ў жыцці.

Побач з такім чалавекам немагчыма працаваць дрэнна. Таму і калектыў бібліятэкі юрфака — працавіты, дружны. А паказчыкі — у наяўнасці. У 1975 годзе бібліятэка была ўзнагароджана за першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. Па словах В. П. Ананькі, першае месца і ў 1977 годзе яны не збіраюцца ўступаць нікому.

Шмагранная работа бібліятэкара. Не толькі апрацоўка, не толькі складанне каталогаў, не толькі выдача кніг. Цесны кантакт падтрымлівае бібліятэка з кафедрамі факультэта. Падбірае неабходную літаратуру, арганізоўвае выстаўкі, канферэнцыі і дыспуты.

Сціплая, мілая жанчына, аўтарытэтны кіраўнік, Валянціна Паўлаўна Ананька накіроўвае работу калектыву. Прыгледзьцеся добра: працуе чалавек, унікае ў кожную дробязь, нічога не пакідае без увагі, усім дапаможа, падзеліцца з кожным тым, што ведае сама, — і, здаецца, нічога няма ў гэтым асаблівага. Мы прывыклі да гэтага. «Так і трэба», — скажаце вы. Зразумела. Але давайце ўсё ж такі выдзелім гэтую жанчыну. Талент быць арганізатарам, чулым і разумным кіраўніком даецца не кожнаму і даецца не адразу.

Валянціна Паўлаўна скончыла педагагічнае вучылішча, потым працавала ў бібліятэцы і завочна вучылася на філалагічным факультэце: «Вы ведаеце, — кажа яна, — я б магла пайсці працаваць настаўнікам, гэта работа не менш цікавая і важная. Але... прырасла душой да бібліятэкі, не змагла адсюль пайсці. Гэта мой свет, мой дом».

Кнігі яна палюбіла з дзяцінства і жыццё без іх сабе не ўяўляла А дзе, як не ў бібліятэцы, адчуеш такую блізкасць з імі? Кожная пройдзе праз твае рукі, кожная запомніцца. Я звярнула ўвагу на тое, як беражліва Валянціна Паўлаўна трымае кнігу.

Свае адносіны да яе Валянціна Паўлаўна перадае маладым калегам, студэнтам і выкладчыкам.

Як добра бывае на сэрцы, калі сустрэнеш адкрытага, яснага і сціплага чалавека. Гавораць жа: «сціпласць упрыгожвае». Так, і ўпрыгожвае ўдвая, калі яна непадробная.

**Р. ГОЛЬДЭНБЕРГ.**





# ПАЧАТАК СЯБРОЎСТВА

Камсамольская арганізацыя універсітэта шэфствуе над ГПТВ №№ 38. 34. 12, 47, 76, 25. 107 Кастрычніцкага раёна горада Мінска. Па ініцыятыве адной з секцый шэфскага сектара камітэта камсамола вырашана было ўстанавіць шэфства над вучэбна-вытворчымі групамі падшэфных вучылішчаў. Шэфскім сектарам камітэта камсамола факультэтам было рэкамендавана ўстанавіць шэфства груп, скласці планы сумеснай работы па наступных напрамках: унутрысаюзная работа (правядзенне сумесных камсамольскіх сходаў і пасяджэнняў камсамольскіх бюро груп), ідэалагічная работа (лекцыйная прапаганда, дапамога ў афармленні нагляднай агітацыі і г. д.), культурна-масавая работа (правядзенне сумесных вечароў, «агеньчыкаў», арганізацыя сумесных культпаходаў у тэатры), работа па працоўнаму выхаванню (правядзенне агульных суботнікаў, нядзельнікаў).

Прайшло ўжо нямала часу, і сёння можна смела гаварыць аб эфектыўнасці гэтай формы работы. Напрыклад, студэнтамі кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл біялагічнага факультэта ў падшэфнай 11-й групе ГПТВ № 12 праведзены мерапрыемствы: арганізаван сумесны культпаход у тэатр на п'есу «Святая прастата», прачытана лекцыя «Мікраарганізмы — нашы сябры і ворагі», праведзен сумесны «агеньчык», прысвечаны 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Акрамя работы ў падшэфных групах, камсамольскай арганізацыяй біялагічнага факультэта рэгулярна праводзяцца агульныя мерапрыемствы: прачытаны лекцыі ў гуртку «Юны біёлаг» па тэмах «Наследныя захворванні чалавека», «Мікробы і іх роля ў жыцці чалавека», вучылішчу перададзен гербарый, у якім налічваецца 100 відаў раслін, навучэнцам прачытана лекцыя ў інтэрнаце на тэму «Федэратыўная Рэспубліка Германія ў легендах і рэчаіснасці». Акрамя таго, лектарская група біяфака вядзе вялікую работу з падшэфнымі па прапагандзе аховы прыроды.

Студэнты 2-й групы II курса факультэта радыёфізікі і электронікі разам са сваімі падшэфнымі — навучэнцамі 24-й вучэбна-вытворчай групы ГПТВ № 107 часта праводзяць сумесныя суботнікі. Разам яны працавалі і на Усесаюзным ленінскім камуністычным суботніку. Студэнты 4-й групы I курса юрфака таксама правялі «чырвоную суботу» разам са сваімі падшэфнымі — навучэнцамі 9-й групы ГПТВ № 25. І студэнты і навучэнцы прыйшлі да аднаго вываду — разам працаваць і лягчэй і весялей.

Пасля сумеснай работы студэнты не спяшаюцца развітвацца са сваімі малодшымі сябрамі. Яны распытваюць сваіх падшэфных аб вучобе, тыя з не меншай цікавасцю распытваюць аб універсітэце, аб студэнцкім жыцці. Сумесная работа стала пачаткам моцнага сяброўства.

**А. КУЗЮКОВІЧ,**
**студэнтка II курса гістфака, член камітэта камсамола.**

# ПА ПРАБЛЕМАХ АХОВЫ ПРЫРОДЫ

Закончылася II канферэнцыя маладых вучоных Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна на тэму «Сучасныя праблемы аховы навакольнага асяроддзя».

Канферэнцыя, якая была арганізавана камітэтам камсамола і саветам маладых вучоных універсітэта, прыцягнула шырокую ўвагу маладых вучоных, выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў універсітэта, а таксама прадстаўнікоў шэрагу навукова-даследчых устаноў горада Мінска.

У рамках канферэнцыі разглядаліся пытанні, звязаныя з праблемамі аховы паветра, вады, глебы і раслінкасці ва ўмовах узмоцненага антрапагеннага ўздзеяння і сучасныя метады вывучэння ступені ўздзеяння тэхнагеннага фактару на навакольнае асяроддзе.

Вялікую цікавасць удзельнікаў канферэнцыі выклікала работа секцыі пад старшынствам прафесара В. Ф. Якушкі. Былі заслуханы і абмеркаваны даклады, якія змяшчалі шэраг каштоўных назіранняў і практычных прапаноў па распрацоўцы пытанняў глебавага покрыва, паветра, водных рэсурсаў, расліннага і жывёльнага свету, па прымяненню фізічных і хімічных метадаў ачысткі паветра і сцёкавых вод прамысловых прадпрыемстваў.

Адзначаючы ўзрослы ўзровень дакладаў, канферэнцыя адобрыла даследаванні, якія праводзіліся на геаграфічным факультэце В. Раманавым, А. Рачэўскім, З. Шаблінскай, Ю. Ляшковічам, П. Лапухом, біёлагам А. Ганчанкавай, хімікамі Л. Кісялёвай, А. Давыдоўскай і іншымі маладымі вучонымі універсітэта.

**А. ЦІТОВА.**

# ГЭТА ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ КОЖНЫ

Грамадзянская абарона СССР з'яўляецца састаўной часткай сістэмы агульнадзяржаўных абаронных мерапрыемстваў, якія здзяйсняюцца ў мірны і ваенны час у мэтах аховы насельніцтва і аб'ектаў народнай гаспадаркі краіны ад зброі масавага паражэння.

Адной з рашаючых умоў паспяховага здзяйснення мерапрыемстваў па ахове насельніцтва і забеспячэнню ўстойлівасці работы прадпрыемстваў народнай гаспадаркі ва ўмовах ракетна-ядзернай вайны з'яўляецца арганізацыйна-тэхнічная і маральна-псіхалагічная падрыхтоўка насельніцтва. Канкрэтна гэта абавязвае кожнага:

1. Актыўна ўдзельнічаць у правядзенні мерапрыемстваў па грамадзянскай абароне як па месцу работы, так і па месцу жыхарства.

2. Вывучыць параджаючыя фактары зброі масавага паражэння і спосабы аховы ад іх.

3. Цвёрда ведаць сігналы апавяшчэння грамадзянскай абароны і правільна дзейнічаць па іх.

4. Ведаць месцы знаходжання сховішчаў і супрацьрадыяцыйных прыкрыццяў па месцу работы і ў жылых масівах. Умець абсталяваць прасцейшыя прыкрыцці і прыстасоўваць пад супрацьрадыяцыйныя прыкрыцці склепы, падвалы і іншыя збудаванні.

5. Вывучыць асноўныя патрабаванні па эвакуацыі насельніцтва з гарадоў, прыёму і размяшчэнню яго ў сельскай мясцовасці. Дакладна выконваць свае абавязкі пры правядзенні эвакамерапрыемстваў.

6. Умець карыстацца індывідуальнымі сродкамі аховы, а таксама выраблаць прасцейшыя сродкі аховы органаў дыхання і прыстасоўваць звычайнае адзенне і абутак для аховы скуры.

7. Авалодаць неабходнымі навыкамі пры правядзенні выратавальных работ.

8. Вывучыць і практычна засвоіць спосабы аказання самадапамогі і ўзаемадапамогі пры паражэннях.

Поспех выканання задач па грамадзянскай абароне ў ваенны час у рашаючай ступені будзе залежаць ад палітычнай свядомасці, высокага маральнага духу, псіхалагічнай стойкасці і мужнасці людзей. Праяўленне гэтых якасцей магчыма толькі пры цвёрдым веданні сваіх абавязкаў па грамадзянскай абароне. Таму кожны грамадзянін павінен ясна ўяўляць сабе, з чым ён сутыкнецца ў час вайны, якія ад яго спатрэбяцца дзеянні, усведаміць і вызначыць сваё месца і ролю ў абаронных мерапрыемствах і падрыхтаваць сябе да выканання абавязкаў у самай складанай абстаноўцы.

Сур'ёзнай праверкай гатоўнасці асабовага саставу універсітэта да выканання сваіх абавязкаў па грамадзянскай абароне з'явілася комплекснае аб'ектавае вучэнне ГА, якое было праведзена ў канцы мая. Акрамя кіруючага і камандна-начальствуючага саставу ў вучэнні прынялі ўдзел фарміраванні грамадзянскай абароны, а таксама прафесарска-выкладчыцкі састаў, вучэбна-дапаможны персанал, аспіранты, рабочыя, служачыя і студэнты, не ўваходзячыя ў фарміраванні. У ходзе вучэння былі практычна выкананы мерапрыемствы, прадугледжаныя планам грамадзянскай абароны аб'екта пры ўзнікненні пагрозы нападзення праціўніка.

Важным этапам падрыхтоўкі да гэтага вучэння быў месячнік грамадзянскай абароны, які праводзіўся ва універсітэце ў красавіку-маі гэтага года. У гэты перыяд для студэнтаў і супрацоўнікаў дэманстраваліся вучэбныя і навукова-папулярныя кінафільмы па ГА, праводзіліся спаборніцтвы па выкананню нарматываў 20-гадзіннай праграмы ўсеагульнага абавязковага мінімуму ведаў насельніцтва па ахове ад зброі масавага паражэння і іншыя мерапрыемствы. У працэсе спаборніцтваў супрацоўнікі і аспіранты здавалі залікі па раздзелу «Грамадзянская абарона» Усеагульнага фізкультурнага комплексу «Гатоў да працы і абароны СССР» (ГПА).

Вучэнне паказала высокую свядомасць і добрыя веды правілаў грамадзянскай абароны студэнтамі і супрацоўнікамі універсітэта.

**В. КАСАЧОЎ,**
**начальнік штаба грамадзянскай абароны БДУ.**

# ЗНАЁМСТВА З «АРСЕНАЛАМ»

Большасць ішла на канцэрт «Арсенала», амаль нічога аб ім не ведаючы, хіба што артыкулы ў часопісе «Юность». Моладзь уваходзіла ў актавую залу з адной толькі цікавасцю: што ж прынясуць ім «арсенальцы» і іх джаз-рок? А ў гэты час за кулісамі...

Аляксей Казлоў (саксафон-альт):

— Многія аспрэчваюць такую назву нашага стылю ігры, як джаз-рок. Адны сцвярджаюць, што, акрамя джазавых інтанацый, у нашай музыцы нічога няма; іншыя, што гэта «рок», прычым скапіраваны ў груп «Кроў, пот і слёзы» і «Чыкага». Так, у рэпертуар мы ўвялі некаторыя іх мелодыі, але яны не прыносяць нам поўнага музычнага задавальнення. У сваіх жа кампазіцыях, я мяркую, можна дасягнуць поўнага самавыражэння і набыць пэўны творчы воблік.

Пакуль, акрамя нас, у стылі джаз-рок у краіне ніхто не іграе. Нашы першыя крокі робяцца ўсляпую, на вобмацк.

«Песняры» пачалі з адраджэння народнаіі музыкі, стварыўшы свой «фолк-рок». Вось і мы хочам стварыць савецкі джаз-рок.

На сцэне—дзесяць захопленых і ўлюбёных у сваю прафесію музыкантаў. Раздаюцца першыя акорды, і я ўспамінаю словы Аляксея: «Вельмі важна завалодаць залай, наладзіць з ёй трывалы кантакт.

Часам прама ў ходзе канцэрта мы мяняем частку праграмы. Адбываецца своеасаблівая падстройка пад аўдыторыю.

Але ўсё гэта, я яшчэ раз паўтараю, робіцца выключна для таго, каб людзі зразумелі нашу музыку».

Між тым сярэдневяковыя матывы ў «Яблыку разладу» гітарыста Віктара Разенталя змяняюцца ўсходняй экзотыкай «Гісторыі адной помсты» арганіста Ігара Саульскага. Гучыць кампазіцыя Аляксея Казлова «Башня са слановай косці» і «Свабодны джазавы танец»...

Казлоў:

— Твораў у стылі джаз-рок яўна не хапае, таму ў большасці выпадкаў музыку пішам самі. Нам хоча дапамагчы кампазітар Юрый Саульскі, бацька Ігара.

І яшчэ. Некаторыя знаходзяць падабенства паміж «Арсеналам» і групай «Выключэнне», але гэта падабенства мінімальнае. Пакуль застаецца па-за нашым рэпертуарам класіка, але мы паспрабуем звярнуцца да яе.

...А ў зале доўга не сціхаюць апладысменты вакальнаму майстэрству Тамары Квірквеліі, Мехрдада Бадзі, Віктара Заікіна, якія падаравалі зале рытмы амерыканскай вёскі і негрыцянскія блюзы. Апладзіруюць віртуознай ігры І. Саульскага і А. Казлова, тэмпераментнасці ўдарных С. Ходнева і В. Ізюмчанкі.

Музычнае знаёмства адбылося, і было ўзаемна цікавым і пазнавальным.

Можа не ўсім прысутным спадабаўся стыль «Арсенала», але ў цэлым ансамбль прымусіў аб сабе думаць, прыцягнуў сваім пошукам, знаходкамі.

А. ГАЙДУК,
студэнт журфака.



## Мінус... 196 па Цэльсію

Калі ўваходзіш у сектар хіміі нізкатэмпературных рэакцый, які знаходзіцца ў цокальным паверсе універсітэта, то адразу здаецца, што пападаеш у куток алхіміі і чорнай магіі. Але замест здабычы золата ці срэбра тут вывучаюцца нізкатэмпературныя рэакцыі метадамі храматаграфіі і спектраскапіі. Пільна сочаць за прыладамі дзяўчаты-дыпломніцы з V курса хімічнага факультэта.

Працуе тут чалавек, пра якога студэнткі гавораць: «майстар залатыя рукі». Гэта старшы тэхнік В. Горлаў. Ніводная справа ў сектары не абыходзіцца без яго ўдзелу. Ён заўсёды дапамагае студэнткам і словам і справай.

Хімія нізкатэмпературных рэакцый як навука існуе ўсяго толькі 20 год. Гэта яшчэ зусім новая галіна ведаў, і таму працаваць у ёй асабліва цікава, таму што, як дзяўчаты жартуюць, могуць нават у летнюю спякоту зрабіць сцюжу, і прадэманстравалі гэта. З балона набралі шклянку важкага азоту з тэмпературай — 196 па Цэльсію і разлілі па падлозе. Азот у момант рассыпаўся промнямі і выпарыўся, а на мяне дыхнула холадам. Але ніколі не холадна студэнткам-дыпломніцам у атмасферы добразычлівасці і сяброўскай дапамогі, якая існуе у сектары, якім кіруе дацэнт В. Лішнеўскі.

А. ЛІСТОЎ.

## ТАЛЕНТЫ ПАДРЫХТОЎЧАГА



Адбыўся агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці падрыхтоўчага аддзялення БДУ. Аўтарытэтнае журы ацэньвала выступленні ўдзельнікаў конкурсу. Асабліва добрае ўражанне у гледачоў засталося пасля літаратурна-песеннай кампазіцыі «Памяці паўшых», з якой выступіла група філолагаў. Яны і занялі першае месца. Добра выступілі гісторыкі, другая група юрыстаў. У групе журналістаў, па словах аднаго з членаў журы, была творчая справаздача, а не мастацкая самадзейнасць. Але, тым не менш, даволі цікава выканаў песні Ігар Мартынаў, добрыя вершы прачыталі А. Цвях, А. Веліксонаў, В. Барысевіч. Са сваёй новай паэмай «Людзі з партбілетам» выступіў В. Бяляеў.

Усім спадабалася выступленне прадстаўніцы групы матэматыкаў Ларысы Карповіч, якая выканала песню «Беларусь».

Але не ўсе аднесліся да конкурсу з адказнасцю. Было і так, што калектыў цэлага аддзялення прадстаўлялі ўсяго некальні чалавек. Нельга сказаць, што нумары былі дрэннымі, але вось іменна масавага ўдзелу ў аглядзе-конкурсе яўна не хапала. Некаторыя групы «па загадкавых прычынах» не выступалі зусім.

Увогуле ж конкурс пакінуў добрае ўражанне, паказаў, што і ў нас на падрыхтоўчым аддзяленні ёсць шмат талентаў, шмат здольнасцей.

М. ДУБОВІК,
слухач падрыхтоўчага аддзялення
групы журналістаў.

Фота аўтара.

## СУПРАЦЬ ПЕРАТАМЛЕННЯ

**Як захаваць добрую працаздольнасць у час экзаменаў! Старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту БДУ У. РЭЙЗІН дае такія парады:**

Пастаянная інтэнсіфікацыя вучэбнага працэсу, цесна звязаная з навукова- тэхнічнай рэвалюцыяй, патрабуе ад студэнтаў вялікай аддачы сіл, высокага нервова-эмацыянальнага напружання. Працоўны дзень студэнта найчасцей роўны 10—12 гадзінам, праходзіць пераважна ў аўдыторыях, лабараторыях, бібліятэках — г. зн. ва ўмовах малой рухальнай актыўнасці (гіпадынаміі). Гэта неспрыяльна адбіваецца на здароўі студэнтаў.

Даследаванні паказваюць, што ўжо к канцу першага семестра разумовая працаздольнасць студэнтаў паніжаецца ў сярэднім на 40 працэнтаў. У перыяд экзаменацыйнай сесіі нагрузка на мозг яшчэ больш узрастае, а рухальная актыўнасць памяншаецца, што найчасцей прыводзіць даператамлення і іншага хваравітага стану.

Ліквідаванню гэтых негатыўных з'яў у значнай ступені дапамагаюць фізічныя практыкаванні і правільны спосаб жыцця. Трэба цвёрда памятаць, што вучыць запар больш дзвюх гадзін нямэтазгодна, бо мозг губляе здольнасць да эфектыўнага ўспрымання матэрыялу. Неабходна рабіць перапынкі для прагулкі ці для выканання комплексу гімнастычных практыкаванняў.

У даследаваннях, праведзеных у радзе савецкіх ВНУ, у тым ліку і ў нашым універсітэце, адзначаецца, што разумовую працаздольнасць найлепшым чынам аднаўляюць практыкаванні, выкананне якіх паніжае тонус крованосных сасудаў мозгу. Гэта практыкаванні на вярчэнне галавы, павароты цела, практыкаванні, прыцягваючыя да работы мышцы верхняй часткі тулава.

Прапануецца наступная схема комплексу гімнастычных практыкаванняў.

**Практыкаванне 1.** Хадзьба на месцы або з перамяшчэннем з вярчэннем наперад і назад рук, сагнутых у локцевых суставах (выканаць 7—8 разоў).

**Практыкаванне 2.** Са стойкі ногі паасобку, нахіл уперад, расслабіць рукі. Затым прагнуцца, галаву назад (глыбокі выдых на абодва рухі. Выпрамляючыся пасля прагінання, удых. Выканаць 6—8 разоў).

**Практыкаванне 3.** Са стойкі ногі паасобку, прысесці. Устаючы, паварот тулава ўправа з махам рук у бок. Тое ж — улева (выдых на абодва рухі. Выпрамляючыся пасля павароту, удых. Выканаць 10—12 разоў).

**Практыкаванне 4.** Ва ўпоры лежачы згібанні і выпрамленні рук (адціскванні). Выканаць 10—12 разоў).

**Практыкаванне 5.** Падскокі на месцы з наступным пераходам на хадзьбу ў розных напрамках (40—80 разоў, у залежнасці ад фізічнай падрыхтаванасці).

**Практыкаванне 6.** Са стойкі ногі паасобку, паварот галавы ўлева і ўправа, нахіл галавы ўперад і назад, паварот галавы ўлева і ўправа (выконваць у спакойным тэмпе на працягу адной хвіліны, дыханне адвольнае).

Падобныя комплексы практыкаванняў, калі іх выконваць 3—4 разы ў дзень, у спалучэнні з прагулкамі на свежым паветры, своечасовым харчаваннем і сном, дапамогуць на працягу экзаменаў падтрымліваць аптымальную працаздольнасць, захаваць здароўе.

Лісток ДАІ.

## Прадбачыць небяспеку...

Сучасны вадзіцель павінен вывучаць паводзіны пешаходаў, іх псіхалогію, клапатліва адносіцца да іх бяспекі. Часам гэтага не хапае вадзіцелям. Памойму, тут і крыецца першапрычына мноства наездаў машын на людзей. Канешне, пешаходы таксама не бязгрэшныя. Асабліва небяспечныя п'яныя на дарозе. «Хадзячыя НЗ» (надзвычайныя здарэнні).— гавораць аб іх вадзіцелі.

Небяспека падпільноўвае вадзіцеля ў самых нечаканых месцах, у самы непадыходзячы момант... Найбольшая магчымасць паяўлення пешахода перад машынай — з-за стаячага транспарту, асабліва на разваротных колах, канцавых прыпынках у мікрараёнах, каля пунктаў «цягі» людзей (відовішчных, прадпрыемстваў гандлю, рынкаў, стадыёнаў, месцаў перасадкі з маршрута на маршрут, навучальных устаноў, вакзалаў). Праезд з высокай хуткасцю міма такіх месцаў — прамы шлях да аварыі.

І яшчэ адно актуальнае пытанне: бяспека пешахода на абазначаным пераходзе. Такі пераход патрабуецца праязджаць з абавязковым пропускам знаходзячыхся на ім пешаходаў. Можна нават і спыніць машыну, калі гэтага патрабуюць канкрэтныя абставіны: дарогу пераходзіць група дзяцей, на шляху аказаўся пажылы пешаход, інвалід, жанчына з дзецьмі і г. д.

Прадбачанне небяспекі — важная якасць дысцыплінаванага вадзіцеля. І гэту якасць павінен выхоўваць у сабе кожны, хто трымае ў руках руль машыны.

В. АНАНЫН,
супрацоўнік ДАІ.

## Ехаць ці не ехаць?!



...Рашае амаль гамлетаўскае пытанне кожны вадзіцель перад уездам ва універсітэцкі двор. Але Гамлету было лягчэй: ён усё ж такі быў прынц і ніколі не ездзіў на аўтамабілі. А хто такі сучасны шафёр перад «Правіламі дарожнага руху»?

Добра яшчэ, калі гэтыя правілы правільна ўжываюцца. А што рабіць у адваротным выпадку?

Знак «Уезд забаронен» вельмі красамоўны, тлумачэння не патрабуе. Але крыху далей выглядае другі знак «Абмежаванне скорасці 5 км у гадзіну». Дык, значыць, можна ехаць, толькі паціху? І, крыху пасумняваўшыся, з рашучасцю Дон-Кіхота прышпорваюць вадзіцелі сваіх шматсільных расінатаў і штурмуюць гэтыя «чортавы вароты», нібы той ветраны млын...

А ўсё ж такі — ехаць ці не ехаць?

М. БАСАЎ.
Фота В. ФІЛІПЧЫКА.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 04259 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Заказ № 1008.